■ Выстава

# ТОЛЬКІ ШАРМ

## Сучасныя жанчыны ўжываюцца ў вобразы дам пачатку XX стагоддзя













**Капялюшык ды пальчаткі, сукенка з тонкай тканіны ды туфлікі ручной работы... Усё, завязваю з джынсамі! Уявіўшы сябе вытанчанай дамай, разумею, што не хачу выходзіць з вобразу. Хоць бы ў думках. Бо з сабой не забярэш і, на жаль, нават не купіш строі, якія можна пабачыць у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь на выставе «Ад крыналінаў і турнюраў да мадэрну». І ўсяго толькі і трэба адкруціць час на нейкія гадоў сто: калекцыя Музея моды Марыны Івановай, якая прыехала да нас з Кіева, дэманструе дзясяткі жаночых убораў пачатку XX стагоддзя.**

Не веру жанчынам, якія кажуць, што не любяць прыгожыя строі. Можа быць, якраз тут той выпадак, калі больш да месца казаць: не ведаем, што любім. І яшчэ адзін момант: адноснасць прыгожага, якая вызначаецца культурнымі традыцыямі, часам і, безумоўна, асабістым густам.

Што на мой густ, дык гэта вельмі вытанчана. Вось аглядаючы гэтыя жаночыя строі, разумееш, чаму ў той час (а гэта канец XIX — пачатак XX стагоддзя) мужчыны былі мужнымі. Калі побач з імі была паненка ў нечым няўлоўным, рамантычным, летуценным і пры гэтым стрымана-загадкавым, то ў іх і не было іншага выйсця, як стаць яе абаронцам. Так, мода мянялася з часам (і тут можна гэта зразумець), але нават падчас цяжкіх перыядаў гісторыі (вайны пачатку XX стагоддзя, напрыклад), жанчына магла не губляць свайго шарму, падкрэсліваючы яго вопраткай ці аксесуарамі. «Цудоўная эпоха», калі можна было змешваць стылі (так званая эклектычнасць) дала жанчынам прастору для фантазіі. А стыль мадэрн нібыта ўнёс крыху шыку ў жыццё, якое ўжо адчувала набліжэнне змен.

І жанчына хацела мяняцца, але адмаўлялася ад тых рыс і драбніц, якія рабілі яе вытанчанай асобай. Як блакітная сукенка пачатку XX стагоддзя, упрыгожаная ірландскімі карункамі, якая належала сям'і Івановых. Ці цудоўная бальная накідка, да якой быццам бы лісты папараці прыгарнуліся. А жанчына і баль — рэчы неадздельныя (цяпер гэта можна назваць дыскатэкай ці клубнай вечарынкай), калі хочацца паказаць сябе ва ўсім бляску. Як жа гэта ўмелі жанчыны заўсёды! Як жа ўмелі радавацца прыгожай сукенцы, блузцы, спадніцы, кашальку, пацеркам. «Літаральна, як і мы сёння. Але ёсць нешта такое, чаму нам у модніц стагадовай даўніны можна павучыцца: ідучы ў след за модай, не забывацца на сваю індывідуальнасць. Таму што самая лепшая сукенка тая, якой не будзе больш ні ў каго, якая пасуе менавіта табе. Тут ёсць уборы, якія існуюць толькі ў адным экзэмпляры. Фактычна як творы мастацтва. І тады трэба думаць, як іх захаваць — а гэта таксама вымагае майстэрства, клопату, пошуку асаблівых тэхналогій.

У экспазіцыі строі, створаныя да 1940 года. Між іншым, калекцыя кіяўлянкі Марыны Івановай пачынала складацца з убораў, якія дажылі з часоў яе бабуль. Дызайнер інтэр'ераў па прафесіі ўмудрылася ператварыць сваю ўласную кватэру ў музей, дзе захоўваюць і выстаўленыя сукенкі, якім гадоў 200! Натуральна, што да тых, самых першых, экспанатаў дадаліся потым унікальныя гістарычныя дамскія строі, знойдзеныя на аўкцыёнах. Марына Іванова цягам часу ператварылася ў сапраўдную калекцыянерку, якая літаральна «палюе» на рэдкую рэч, імкнецца абавязкова займець яе: ці то сукенку, сумачку, туфлі, капялюш, парасон ці веер. На тое, каб скарб з некалькіх рэчаў стаў паўнавартаснай калекцыяй, пайшло 30 гадоў. У выніку ў калекцыі ёсць уборы з Францыі, Англіі, Амерыкі, Германіі, Заходняй Украіны. Але асабліва каштоўнымі набыткамі сама ўладальніца лічыць экспанаты з «дзіцячага пакоя». Таму што дзіцячыя рэчы, як правіла, доўга могуць быць ва ўжытку, перадаюцца ў сям'і ад старэйшых дзяцей малодшым, а то і наогул пераходзяць у спадчыну, імі карыстаюцца прадстаўнікі некалькіх пакаленняў. Адпаведна, зношваюцца, выходзяць са строю. У дзіцячай калекцыі Марыны свет маленства ствараецца не толькі з дапамогай вопраткі, але і дзякуючы цацкам, лялькам, калыскам. Гэта тое, што цяжка дапасаваць да паняцця моды, таму што для чалавека няма нічога больш пазачасовага, чым маленства: пара, якая проста была ці ёсць у свядомасці — з усёй той цепльнёй і любоўю, якой яна была ахінутая (а гэта ёсць незалежна ад эпохі, сацыяльнага ладу ці паходжання). Таму гэтая модная выстава — хутчэй сямейная. Дзіўнае падарожжа ў чароўны сон, дзе можна ўбачыць сябе шыкоўнай спадарыняй ці спадаром. І што ёсць увесь наш сучасны гламур?..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Кніжная паліца

# АД МАСКВЫ — ДА БРЭСТА

**У выдавецтве «Русіч» пабачыла свет новае выданне — кніга пад назвай «Ад Масквы да Брэста. Падарожжа па заходняй частцы Саюзнай дзяржавы». У ёй распавядаецца пра асноўныя турыстычныя выдатнасці, якія можна ўбачыць на такой вялікай прасторы.**




Выданне складаецца з 8-мі раздзелаў — Заходняга Падмаскоўя, Смаленскай вобласці і 6-ці абласцей Беларусі. Яго зручна ўзяць з сабой, бо кніга зроблена ў форме даведніка. У ёй змешчана шмат ілюстрацый адметных архітэктурных, а часам і прыродных помнікаў. Даецца гістарычная даведка пра выяўленыя аб'екты. Таксама надрукаваны карты з гістарычнымі планамі гарадоў.

Калі выпраўляцца ў вандроўку па Заходнім Падмаскоўі, то пачаць можна (калі выязджаць з Масквы) з **Вялікіх Вяземаў**, што за 1,5 км ад станцыі Галіцына. Тут размяшчалася першая ад Масквы паштовая станцыя. У канцы XVI стагоддзя вёска стала ўласнасцю Барыса Гадунова, які збудаваў тут сядзібны дом, Троіцкую (цяпер Праабражэнская) царкву, якая ўражвае правільнасцю формаў і вытанчанасцю аздаблення. Варта паглядзець і на надзвычай прыгожую звaніцу пскоўскага тыпу. Дарэчы, мы не будзем разглядаць усе маршруты падрабязна, бо яны надзвычай насычаныя, толькі згадаем, з чаго яны пачынаюцца — каб заінтрыгаваць чытача...

Першае месца Смаленскай вобласці, якое раяць наведаць стваральнікі кнігі, — гэта горад **Гагарын**, былы Гжацк. Гэтае месца ўзнікла, калі Пётр I выдаў указ аб стварэнні гжацкай прыстані для забеспячэння хлебам Санкт-Пецярбурга. Менавіта адсюль родам славуты першапраходзец сусвету, у гонар якога горад пасля быў перайменаваны. Зразумела, у горадзе стаіць помнік самому Юрыю Гагарыну, захаваўся дом, у якім ён жыў, і машына, падараваная кіраўніцтвам. Помнік пастаўлены таксама і Ганне Цімафееўне — маці касманаўта. Можна палюбавацца і дзвюма культавымі пабудовамі, якія ганарацца ўсе гараджане, — Дабравешчанскім саборам і Казанскай царквой, пабудаванай у стылі, блізкім да нарышкінскага барока.

Горад **Орша**, з якога распачынаецца вандроўка па Віцебскай вобласці, стваральнікі кнігі называюць варотамі ў Беларусь. Тут можна паглядзець калегіум езуітаў, створаны пры Льву Сапегу (сёння будынак адноўлены), Куцеінскі манастыр (менавіта тут надрукаваны «Буквар» Спірыдона Собаля), Ільінскую царкву канца XIX стагоддзя, а таксама мясцовае замчышча-гарадзішча.

Магілёўскую вобласць найперш прадстаўляе старажытны **Мсціслаў.** Тут варта ўбачыць кармеліцкі касцёл першай паловы XVII стагоддзя. Цікавасць уяўлююць таксама Мікалаеўскі сабор, царква Аляксандра Неўскага. Варта паглядзець і на старадаўнае гарадзішча.

Адзін з адметных гарадоў Гомельскай вобласці — **Чачэрск.** Тут варта паглядзець адрэстаўраваную гарадскую ратушу, пабудаваную ў канцы XVIII стагоддзя, — яна мае 5 драўляных вежаў. Таксама цікавасць уяўляе Спаса-Праабражэнская царква, пабудаваная ў канцы XVIII стагоддзя ў стылі класіцызму італьянскімі майстрамі.

У Мінскай вобласці можа зацікавіць **Барысаў.** Тут да сённяшняга дня захаваліся дом колішняга казначэйства, сінагога, 10 жылых каменных дамоў XIX стагоддзя, будынак чыгуначнага вакзала пачатку XX стагоддзя. Візітная картка горада — Уваскрэсенскі сабор, збудаваны ў псеўдарускім стылі ў другой палове XIX стагоддзя. Ён мае 9 купалаў рознага памеру, багата дэкараваны белай цэглай.

Гродзенская вобласць таксама багатая на архітэктурныя каштоўнасці. Напрыклад, у горадзе **Ліда** варта падысці да старажытнага замка XIII стагоддзя, збудаванага князем Гедымінам. Таксама тут можна паглядзець былы Іосіфаўскі касцёл піяраў, цяпер — архістратыга Міхаіла, і Крыжаўздзвіжанскі касцёл.

Адметны горад Брэсцкай вобласці — **Пінск** (дарэчы, другі горад пасля Гродна па захаванасці манументаў). Цэлы квартал тут займае манастыр францысканцаў, заснаваны ў XIV стагоддзі. Галоўны касцёл манастыра — Успенскі — пабудаваны ў XVIII стагоддзі, і мае вялікую мастацкую вартасць. У пачатку XIX стагоддзя ў манастыры была ўзведзена асобная званіца — яна таксама захавалася да нашых дзён. У гэтым горадзе можна убачыць іезуіцкі калегіум, касцёл Карла Барамея, палац Бутрымовіча і шмат чаго іншага.

Такім чынам, кніга «Ад Масквы да Брэста» вартая таго, каб браць яе з сабою ў вандроўкі. Багата ілюстраваная, з добрымі гістарычнымі звесткамі, яна дапаможа вам не разгубіцца, выбіраючы маршрут.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*